УДК

*В. В. Навіцкая*

## Навуковае даследаванне – аснова экспазіцыйнай дзейнасці беларускіх музеяў

*Засяроджваецца ўвага на ролі навуковага даследавання ў праектаванні часовых і пастаянных экспазіцый, вылучаюцца этапы іх стварэння. Тэма разглядаецца на прыкладзе дзейнасці музеяў гістарычнага профілю: Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі. Асаблівае значэнне надаецца падрыхтоўчаму этапу, калі вывучаюцца і аналізуюцца музейныя калекцыі, неабходная навуковая літаратура і архіўныя матэрыялы, распрацоўваецца дакументацыя. Аўтар прыходзіць да высновы, што інтэнсіўная экспазіцыйная дзейнасць музеяў садзейнічае захаванню і актуалізацыі духоўна-маральных каштоўнасцей беларускага грамадства.*

***Ключавыя словы:*** *музей, музейная экспазіцыя, навуковае даследаванне, навуковае праектаванне экспазіцый, гістарычны профіль, музеязнаўства.*

*V. Navitskaya*

## Scientific research is the basis of the exhibition activity of belarusian museums

*The article focuses on the role of scientific research in the design of temporary and permanent exhibitions, highlights the stages of their creation. The topic is considered on the example of the activities of museums of a historical profile: the National Historical Museum of the Republic of Belarus, the Belarusian State Museum of the History of the Great Patriotic War, the Memorial Complex "Brest Hero Fortress", the Grodno State Museum of the History of Religion. The author attaches special importance to the preparatory stage, when it is necessary to study and analyze museum collections, necessary scientific literature and archival materials, and develop documentation. The author comes to the conclusion that the intensive exhibition activities of museums contribute to the preservation and actualization of the spiritual and moral values of Belarusian society.*

***Key words:*** *museum, museum exposition, scientific research, scientific design of expositions, historical profile, museology.*

Адзін з асноўных кірункаў музея – навукова-даследчая дзейнасць. Яна заключаецца ў камплектаванні фондаў, вывучэнні калекцый, правядзенні даследаванняў у галіне захавання і аховы музейных прадметаў, праектаванні часовых і пастаянных экспазіцый, падрыхтоўцы культурна-адукацыйных праграм і навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў, публікацыі манаграфій, навуковых артыкулаў, альбомаў, буклетаў, даведнікаў і г. д. За пералічанымі напрамкамі

дзейнасці музеяў бачыцца велізарная праца навуковых супрацоўнікаў, у якой многае залежыць ад іх прафесійнай падрыхтоўкі, накопленага вопыту, сумленных адносін у выкананні абавязкаў і крэатыўнага падыходу да справы. З цягам часу навуковы супрацоўнік пераўтвараецца ў шматграннага спецыяліста, без якога нельга ўявіць сучасны музей і ад працы якога залежаць усе астатнія віды музейнай дзейнасці, у тым ліку рэкламнай і сацыяльнай камунікацыі.

У межах артыкула засяродзім увагу на ролі навуковых даследаванняў у кантэксце экспазіцыйнай дзейнасці музея. Як сцвярджае М. А. Бяспалая, экспазіцыя – гэта «лагічна пабудаваная сукупнасць музейных прадметаў у пэўнай прасторы, якая выконвае інфармацыйную, камунікатыўную, выхаваўчую, эстэтычную і іншыя функцыі» [2, с. 558].

Узровень навуковых даследаванняў у галіне экспазіцыйнай дзейнасці не дае цэласнага, закончанага ўяўлення аб заканамернасцях пабудовы сучаснай музейнай экспазіцыі, бо гэта бесперапынны працэс, у якім нельга паставіць кропку. Даследчыкі неадразова звярталіся да гэтай тэмы. Так, М. А. Бяспалая [2], У. Ю. Дукельскі [5], Н. М. Здасюк [6], А. Ф. Котс [7], М. Ц. Майстроўская [11], В. І. Мацюшчэнка [9], Т. П. Палякоў [12], Ю. Г. Салова [13], А. Б. Сташкевіч [14], Д. І. Цвярская [16] і інш. надавалі асаблівую ўвагу праблеме навуковага праектавання музейных пастаянных і часовых экспазіцый, ролі навуковага даследавання пры іх падрыхтоўцы.

Асобным блокам можна прадставіць артыкулы навуковых супрацоўнікаў беларускіх музеяў гістарычнага профілю, у якіх падаюцца канцэпцыі і тэматычныя структуры пастаянных і часовых экспазіцый, разглядаюцца праблемы мастацкага праектавання, выкарыстання музейных фондаў у экспазіцыйнай дзейнасці, пошуку рашэнняў.

*Мэта артыкула* – раскрыць асаблівасці навуковага праектавання ў экспазіцыйнай дзейнасці беларускіх музеяў гістарычнага профілю.

Вывучэнне музейнай справы і прафесійны вопыт дазваляюць вылучыць тры этапы навуковага даследавання пры стварэнні пастаянных і часовых экспазіцый.

*Падрыхтоўчы этап* звязаны с пошукам, аналізам і сістэматызацыяй фактаў праз манаграфічныя даследаванні, публікацыі ў перыядычным друку і зборніках канферэнцый, вывучэннем архіўных і фондавых матэрыялаў, атрыбуцыяй прадметаў калекцый, іх кансервацыяй і рэстаўрацыяй, падборам аўтэнтычных матэрыялаў і іх копій. На гэтай стадыі адбываецца выбар спосабаў аптымальнага данясення задумы будучага праекта да наведвальнікаў музея.

*Этап работы над экспазіцыяй* прадугледжвае падрыхтоўку навуковай канцэпцыі або пашыранай тэматычнай структуры, сцэнарыя экспазіцыі, тэматыка-экспазіцыйных планаў, тлумачальных і арыента-

цыйных тэкстаў, этыкетажу, распрацоўку мастацка-архітэктурнага праекта і ў завяршэнне – мантаж экспазіцыі.

На *этапе прадстаўлення вынікаў навуковага даследавання* адбываецца знаёмства з экспазіцыяй наведвальнікамі музея, прасоўванне інфармацыі па створанай экспазіцыі ў сацыяльных сетках і на афіцыйным сайце, публікацыя каталогаў, падрыхтоўка артыкулаў для ўдзелу ў навуковых канферэнцыях і г. д. Кароткачасовасць існавання многіх экспазіцый (нярэдка яны становяцца значнай падзеяй у музеі) з'яўляецца праблемай для іх фіксацыі і аналізу з мэтай асэнсавання і замацавання дасягнутага выніку.

У сучаснай практыцы навуковая канцэпцыя экспазіцыі ўяўляе сабой самастойны навуковы твор, у якім на дзясятках і нават сотнях старонак з тэкстамі, апісаннямі, табліцамі, малюнкамі, фотаздымкамі, картамі падаюцца вынікі скрупулёзнай прапрацоўкі сабраных матэрыялаў з музейных фондаў, бібліятэк, архіваў і іншых устаноў. У ёй вызначаюцца мэты і задачы экспазіцыі, прынцыпы групоўкі матэрыялаў (храналагічны, тэматычны, праблемны і г. д.), метады пабудовы (калекцыйны, ансамблевы, ілюстрацыйна-тэматычны, музейна-вобразны і г. д.), асноўная праблематыка і тэматычная структура, прапануюцца формы яе падачы. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню тэматычнай літаратуры, архіўных матэрыялаў, аналізу музейных калекцый. На падрыхтоўчым этапе вывучэнне носіць музейную накіраванасць. Намаганні навукоўцаў накіраваны на вызначэнне музейных сродкаў, з дапамогай якіх яны змогуць у экспазіцыі адлюстраваць тыя ці іншыя з'явы, падзеі і факты. Паралельна распрацоўваюцца тэматыка-экспазіцыйныя планы (выніковыя дакументы навуковага праектавання экспазіцый), дадаткам да якіх ідуць экспплікацыя, этыкеткі, тлумачальныя тэксты і г. д. Важнымі этапамі пры праектаванні пастаяннай экспазіцыі з'яўляюцца падрыхтоўка архітэктурна-мастацкага рашэння і мантаж.

Пры навуковым праектаванні экспазіцый музейныя супрацоўнікі звяртаюць увагу на асноўную ідэю і прадметна акрэслены змест, без якіх немагчыма ў далейшым дасягнуць вырашэння пастаўленых задач.

Дарэчы, працэс навуковага праектавання экспазіцыі не абмяжоўваецца толькі распрацоўкай дакументацыі, ён прадугледжвае пастаянны аўтарскі нагляд за рэалізацыяй задумы і ўнясенне неабходных карэкціровак. Увогуле навуковае праектаванне музейнай экспазіцыі – гэта не столькі выкарыстанне назапашанага матэрыялу, колькі яго структураванне і пераўтварэнне ў новыя веды праз аб'яднанне розных, часам супрацьлеглых тэорый і канцэпцый.

Такім чынам, стварэнне музейнай экспазіцыі падаецца як складаны навуковы працэс, з якім цесна звязана шматгранная мастацка-творчая дзейнасць. У такой сістэме аб'ядноўваецца канцэптуальная навуковая задума з мастацкай. Па сутнасці, музейная экспазіцыя становіцца

функцыянальным навукова-мастацкім творам, да стварэння якога прыцягваюцца музейныя супрацоўнікі, спецыялісты з розных сфер навукі і мастацтва. У падмурку як пастаяннай, так і часовай экспазіцый падчас іх праектавання знаходзіцца, перш за ўсё, навуковае даследаванне, якое прадугледжвае выкарыстанне супрацоўнікамі музеяў фондавых калекцый, правядзенне работы ў архівах, музеях і іншых установах па пошуку неабходных матэрыялаў для стварэння копій ці дублікатаў, знаёмства з найноўшымі дасягненнямі ў розных галінах ведаў (музеязнаўстве, псіхалогіі, педагогіцы, дызайне і г. д.).

Пры стварэнні часовых экспазіцый праектная дакументацыя абмяжоўваецца сцэнарыем або пашыранай тэматычнай структурай (калі тэрмін экспанавання менш за трыццаць каляндарных дзён) і навуковай канцэпцыяй або пашыранай тэматычнай структурай і архітэктурна-мастацкім рашэннем (калі тэрмін экспанавання больш за трыццаць каляндарных дзён).

Ва ўводзінах да зборніка, прысвечанага музею XXI ст., М. Ц. Майстроўская адзначае, што сучасная экспазіцыя «дэманструе сувязь навукі з разнастайнасцю творчых канцэпцый, розных аўтарскіх поглядаў і пазіцый. Дзякуючы ўключэнню ў творчы працэс мастацка-выразных сродкаў, экспазіцыя набывае новую якасць як самастойны мастацкі жанр экспазіцыйнага дызайну. Асаблівае значэнне набывае пабудова экспазіцыйнага вобраза, стварэнне спецыфічнай экспазіцыйнай драматургіі, пошук арыгінальнай мастацка-прасторавай кампазіцыі, аранжыроўка колера-светлавога асяроддзя, мастацка-функцыянальная якасць экспазіцыі, іншымі словамі, асэнсаванне формы экспазіцыі ў якасці аднаго з важнейшых аспектаў сучаснага музея» (пер. наш. – *В. Н.*) [11, с. 4].

Яркім прыкладам такога падыходу з'яўляецца экспазіцыя мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». На працягу апошніх дзесяцігоддзяў яна некалькі разоў перажывала трансфармацыі праз абнаўленне старых і стварэнне новых экспазіцый, увядзенне інтэрактыўных форм узаемадзеяння з наведвальнікамі, прымяненне разнастайных навуковых тэхналогій і мастацкіх прыёмаў. Так, напрыклад, у адкрытых экспазіцыях «Музей вайны – тэрыторыя міру» (2014) і «Летапіс Брэсцкай крэпасці» (2019) дэманстраваліся рэліквіі фондавых калекцый мемарыяла (знаходкі з раскопак, сярод якіх прадметы побыту, зброя абаронцаў крэпасці, аплаўленая полымем агнямётаў цэгла, аскепкі снарадаў і г. д.), якія былі дапоўнены вобразна-скульптурнымі інсталяцыямі. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, у тым ліку QR-коды, дазволілі ў пашыраным варыянце прадставіць інфармацыю пра падзеі, адлюстраваныя ў экспазіцыі, успаміны ўдзельнікаў бітваў, дакументы, фотаздымкі і кінакадры і інш. [10, с. 22]. Вялікую работу правялі супрацоўнікі комплексу па стварэнні электроннага банка даных на ва-

еннаслужачых гарнізона Брэсцкай крэпасці і іх сямей, падзеленых на чатыры групы: тых, хто працягваў службу ў РСЧА, удзельнікаў партызанскага руху, ваеннапалонных і прапаўшых без звестак [15].

Асобна разгледзім стварэнне новай экспазіцыі ў філіяле мемарыяла «Форт № 5 Брэсцкай крэпасці»[1] (2021). У рабочую групу па яе падрыхтоўцы ўвайшлі супрацоўнікі А. Я. Грыцук, Л. Р. Бібік, А. А. Каркатадзэ, А. У. Міцюкова, А. В. Малочнікаў. Яны падрыхтавалі гісторыка-культурную спецыфіку аб'екта (уключала агляд крыніц і фондавай калекцыі), кароткую гістарычную даведку па гісторыі форта, тэхнічнае апісанне і тэхнічны пашпарт аб'екта. Акрамя гэтага, былі адлюстраваны абгрунтаванне і структура канцэпцыі экспазіцыі, у якой вылучаліся асобныя падраздзелы з апісаннем мэт, задач, прынцыпаў арганізацыі экспазіцыі, тэматычнай структуры (складалася з шасці тэм: «Гісторыя фартыфікацыі», «Брэсцкая крэпасць як фартыфікацыйны аб'ект», «Форты Брэсцкай крэпасці – сведкі часоў», «Гістарычная рэканструкцыя казематаў гаржовай казармы форта № 5 пач. XX ст.», «Капанір, патэрна, парахавы склеп як прыклады тыпавых элементаў у доўгачасовых умацаваннях пачатку XX ст.», «Узоры ўзбраення») і 13 тэматыка-экспазіцыйных комплексаў. Адзначаецца, што створаная экспазіцыя ў форце № 5 садзейнічае яго ўзаемадзеянню з навакольным асяроддзем і захаванню ўнікальнага помніка ваеннага будаўніцтва, а таксама забяспечвае прэзентацыю і пашырэнне доступу да матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Брэсцкай крэпасці.

Асобнай увагі заслугоўвае *Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*, аднаўленая экспазіцыя якога была адкрыта 2 ліпеня 2014 г. і стала своеасаблівым прысвячэннем 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтары канцэпцыі ставілі на мэце стварэнне дынамічнай экспазіцыйнай прасторы з насычанай эмацыянальнай атмасферай. Інфармацыйная сістэма экспазіцыі была аформлена ў адпаведнасці з новымі распрацоўкамі ў галіне мультымедыйных тэхналогій і музейнага дызайну, што з'яўляецца найважнейшай умовай пашырэння камунікатыўных магчымасцей музея. Уся экспазіцыя была пабудавана тэматычнымі блокамі ў храналагічнай паслядоўнасці. Пры стварэнні канцэпцыі экспазіцыі музея і яе архітэктурна-прасторавага рашэння аўтарская група ўлічвала спецыфічны архітэктурны ансамбль новага будынка музея, які складаецца з чатырох блокаў, сімвалізуючых чатыры гады вайны. У выніку ство-

[1] Канцэпцыя стварэння пастаяннай экспазіцыі музея «Форт № 5 Брэсцкай крэпасці» : адобр. навукова-метадычнай радай дзярж. установы «Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» ад 25 кастр. 2019 г. № 5 : прыняты Рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях музейнай справы 27 лют. 2020 г.

раная экспазіцыя ўяўляецца прасторай для ажыўлення гістарычных падзей. Музей пераўтварыўся ў інфармацыйна-экспазіцыйны комплекс, мэта якога – зрабіць успрыманне экспазіцыі наведвальнікамі адрасным, інтэграваць культурны і навуковы патэнцыял музея з патрэбамі сучаснага грамадства [3, с. 49].

Варта адзначыць, што ў экспазіцыях новых залаў былі пашыраны храналагічныя рамкі (1920–1950), што тлумачыцца неабходнасцю паказаць прычыны Другой сусветнай вайны, а таксама прадставіць матэрыялы першых пасляваенных гадоў аднаўлення, каб раскрыць працоўны подзвіг беларускага народа, які ў дастаткова кароткія тэрміны адбудаваў краіну.

Для Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на этапе навуковага праектавання пастаяннай экспазіцыі маюць значэнне часовыя экспазіцыі, частка якіх была арганізавана як сумесныя праекты з расійскімі музеямі. Да іх ліку, напрыклад, можна аднесці праекты з Цэнтральным музеем Вялікай Айчыннай вайны ў г. Маскве і Ульянаўскім абласным краязнаўчым музеем імя І. А. Ганчарова, якія былі прысвечаны 65-годдзю Перамогі. Сумесныя часовыя экспазіцыі, падрыхтаваныя разам з архівамі, дазволілі прадставіць выяўленыя і ўведзеныя ў навуковы абарот невядомыя раней дакументы і архіўныя комплексы, выпрацаваць новыя, больш аб'ектыўныя падыходы да асвятлення гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пераасэнсаваць многія яе гераічныя і трагічныя старонкі [4].

Што тычыцца часовых экспазіцый, падрыхтаваных у апошнія дзесяцігоддзі ў *Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь*, то тут вялікая роля адведзена комплексным і шматгадовым даследаванням прадметаў з фондаў музея, якія былі праведзены супрацоўнікамі аддзелаў рэчавых помнікаў, пісьмовых і выяўленчых крыніц, археалогіі, нумізматыкі і зброі, рэстаўрацыі.

Так, напрыклад, за аснову навуковай канцэпцыі часовай экспазіцыі «Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля», 3D-тур якой прадстаўлены на дадзены момант на афіцыйным сайце музея, была ўзята храналагічная перыядызацыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі, створаная В. Н. Рабцэвічам (рабочая група: Р. Крыцук, Т. Голубева, В. Акудовіч). На часовай экспазіцыі прадстаўлены 13 эпох грашовага абарачэння, пачынаючы ад перыяду рымскага дынарыя (I–IV стст.) і завяршаючы грашыма незалежнай Беларусі. Навуковыя супрацоўнікі музея правялі вялікую працу па атрыбуцыі манет з паступленняў 1950–1960-х гг. Асобнае месца ў навуковай канцэпцыі было адведзена афармленню залы плошчай 195 м$^2$ пад часовую экспазіцыю. Акцэнт зроблены на штучнае асвятленне са светадыёднымі элементамі. Агульная колькасць прадметаў, прадстаўленых у 41 вітрыне, перавысіла 5 000

адзінак. Для дэманстрацыі 24 скарбаў быў выкарыстаны варыянт комплекснага экспанавання. Прадметы ў часовай экспазіцыі, размешчаныя па зігзагападобнай схеме, з мастацкага пункту гледжання зручна раскрывалі тэмы для экскурсійных груп наведвальнікаў. Асобная ўвага надавалася стылізаванаму кабінету нумізмата XIX ст. [8].

У доўгатэрміновым экспазіцыйным праекце «Беларусь XVI–XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы» (аўтар навуковай канцэпцыі – І. Зварыка, мастак – У. Гладкоў) акцэнт зроблены на жыцці магнатаў і шляхты Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. У экспазіцыі, акрамя партрэтаў, прадстаўлены зброя, фарфоравыя і шкляныя прадметы, калекцыі нумізматыкі і сфрагістыкі. Па задумцы Ірыны Зварыка, узоры халоднай і агнястрэльнай зброі дазволілі падкрэсліць мужныя рысы асоб на «сармацкіх» партрэтах, а вырабы са шкла і фарфору далі падставу для размовы аб развіцці мануфактурнай вытворчасці. Дадзены праект быў створаны ў 2002 г. пад назвай «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў», аднак праз 6 гадоў была праведзена рээкспазіцыя з мэтай напаўнення прадметамі з фонду, пасля чаго была зменена назва [1].

Знакавымі праектамі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, створанымі на падставе даследаванняў навуковых супрацоўнікаў, з'яўляюцца «Беларускі рубель. Гісторыя ў чвэрць стагоддзя» да 25-годдзя нацыянальнай беларускай валюты (2019); «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры» (2021–2022); «Лёс Музея – Лёс Краіны. Шлях даўжынёю ў стагоддзе» (2021–2022) і інш.

Асобнае месца сярод музеяў гістарычнага профілю займае *Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі*, у якім можна даведацца пра развіццё розных канфесій, беларускія звычаі і традыцыі. Пры праектаванні пастаяннай экспазіцыі «Эпоха. Час. Будынак» увага была засяроджана на раскрыцці агульных аспектаў гарадской культуры.

Будынак музея з'яўляецца помнікам грамадзянскай архітэктуры эпохі класіцызму сярэдзіны XVIII ст., да ліку яго ўладальнікаў можна аднесці прадстаўнікоў вядомых шляхецкіх родаў: Караля Храптовіча, Антонія Тызенгаўза, Францішка Мучынскага, Ігнація Ляхніцкага. У распрацаванай і пабудаванай у 2009 г. экспазіцыі, якая была размешчана ў пяці залах анфіладнай часткі палаца на першым паверсе, асвятляецца не толькі гісторыя палаца, але раскрываецца праз партрэты, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мэблю, абразы, кнігі і іншае свет сямейнага жыцця і культурных традыцый гарадской эліты XVIII – пачатку XX ст.

Экспазіцыя «Рэлігія і культура ў Беларусі» (2010 і 2012 гг.), была прадстаўлена ў 13 залах на другім паверсе палаца. Адзначалася якасная навуковая апрацоўка прадстаўленых музейных прадметаў. Галоўная мэта экспазіцыі, накіраваная на раскрыццё культуратворчай ролі

рэлігійнага фактару ў кантэксце развіцця традыцыйных хрысціянскіх канфесій, ісламу, іўдаізму на беларускіх землях, была дасягнута праз удалае спалучэнне экспанатаў і яе пабудовы такім чынам, што прасторавая арганізацыя сама накіроўвала наведвальнікаў па задуманым маршруце і дыктавала паслядоўнасць агляду.

Паралельна з падрыхтоўкай навуковай канцэпцыі стацыянарнай экспазіцыі ў перыяд правядзення рамонтна-рэстаўрацыйных работ у палацы ў 2006–2009 гг. і пасля іх заканчэння не спынялася праца па арганізацыі і правядзенні часовых экспазіцый на пляцоўках іншых музеяў. Найбольш адметныя сярод іх: «Повязь часоў – беларускі ручнік», «Біблія – кніга кніг», «Барока ў Беларусі», «Свет сакральнага мастацтва», «Гарадская культура», «Святыя і падзвіжнікі хрысціянскай царквы», «Вобраз Маці Божай у іканапісе», «Паміж небам і зямлёй», «Божае адкрыццё ў зямных вобразах. Хрысціянскія сюжэты ў італьянскіх гравюрах XIX стагоддзя», «Вобраз, адліты з металу». Усе гэтыя часовыя экспазіцыі падсумоўвалі вынікі шматгадовай працы па сістэматызацыі, навуковай апрацоўцы і папулярызацыі музейных прадметаў.

Збор музейных прадметаў, іх вывучэнне і папулярызацыя – кірунак навукова-фондавай работы музея. Прыкладам рэалізацыі шматлікіх задач музейнай дзейнасці з'яўляецца часовая экспазіцыя «Нябачнае захаванае» (2022), на якой былі прадстаўлены 728 прадметаў з 21 калекцыі, найбольш каштоўныя і цікавыя помнікі рэлігійнай і свецкай культуры XVI–XX стст. Яна падкрэсліла, што музеі застаюцца надзейнымі захавальнікамі гістарычнай памяці і спадчыны мінулых эпох.

Такім чынам, менавіта навуковае даследаванне іграе галоўную ролю пры праектаванні пастаянных і часовых экспазіцый. Разуменне асноўнай ідэі і канкрэтнага зместу на першапачатковым этапе дазваляе ў будучым дасягнуць вырашэння пастаўленых адукацыйных і выхаваўчых задач. Асаблівае значэнне пры падрыхтоўцы надаецца вывучэнню і аналізу музейных калекцый, навуковай літаратуры і архіўных матэрыялаў, распрацоўцы дакументацыі. Вынікам удалага спалучэння навуковага працэсу з шматграннай мастацка-творчай дзейнасцю і электроннымі тэхналогіямі з'яўляецца стварэнне ілюзіі «пагружэння» наведвальніка ў прадметна-прасторавае асяроддзе музейных экспазіцый.

Падводзячы вынікі, можна сказаць, што навуковае даследаванне музейных экспазіцый садзейнічае павышэнню эфектыўнасці музейнай дзейнасці, фарміраванню калектыўнай свядомасці, вывучэнню і захаванню гістарычнай памяці.

*1.* Беларусь XVI–XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы [Электронны рэсурс] // Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://histmuseum.by/by/exhibitions-events/exhibition-zhyvjoly-svetu/. – Дата доступу: 18.05.2022.

2. *Бяспалая, М. А.* Навуковае абгрунтаванне экспазіцыйнага праектавання ў музеях / М. А. Бяспалая // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 557–561.

3. *Галинская, А. В.* Научная концепция Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны : история и проектирование экспозиции на современном этапе / А. В. Галинская // История Великой Отечественной войны в современных экспозициях музеев: генезис, проблемы, опыт : сб. материалов Межрегиональной науч.-практ. конф., Москва, 8 нояб. 2013 г. – М., 2015. – С. 47–50.

4. *Галинская, А. В.* Совместные выставочные проекты – творческий потенциал для создания новой экспозиции / А. В. Галинская // Первый Национальный форум «Музеи Беларуси», Гродно, 12–14 окт. 2012 г. : сб. материалов деловой программы / Ин-т культуры Беларуси. – Минск, 2013. – С. 280–282.

5. *Дукельский, В.* В поисках музейной концепции истории / В. Дукельский // На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция (теория и практика, искусство экспозиции, новые сценарии и концепции) : сб. науч. тр. / редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.), Н. А. Никишин, Т. П. Поляков ; М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии. – М., 1997. – С. 33–41.

6. *Здасюк, Н. М.* Камплектаванне музейных фондаў як сродак пашырэння крыніцазнаўчай базы гістарычных даследаванняў / Н. М. Здасюк // XXI век : актуальные проблемы исторической науки : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. Белорус. гос. ун-та, Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2004. – С. 102–104.

7. *Котс, А. Ф.* О научно-исследовательской работе музеев / А. Ф. Котс // Труды Государственного Дарвиновского музея. Вып. IV : Научно-исследовательская работа в естественно-научном музее. – М., 2001. – С. 4–35.

8. *Крыцук, Р. І.* Выстава «Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля», альбо Некалькі слоў аб стварэнні нумізматычных экспазіцый / Р. І. Крыцук // Краязнаўчыя запіскі : зб. арт. / Гродзенскі дзярж. гісторыка-археалагічны музей. – Гродна, 2018. – Вып. 11. – С. 147–151.

9. *Матющенко, О. И.* Разработка научного проекта экспозиции / О. И. Матющенко. – Томск : Изд. Дом Томского гос. ун-та, 2018. – 72 с.

*10.* Музеи Беларуси = Музеі Беларусі = Museums of Belarus : фотоальбом / ред. совет : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.] ; пер. на англ. яз.: А. В. Титова, Ю. В. Баженов. – Минск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2018. – 447 с. : цв. ил.

*11.* На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция (теория и практика, искусство экспозиции, новые сценарии и концепции) : сб. науч. тр. / редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.), Н. А. Никишин, Т. П. Поляков ; М-во культуры РФ, Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии. – М. : РИК, 1997. – 216 с.

12. *Поляков, Т. П.* Как делать музей? (О методах проектирования музейной экспозиции) / Т. П. Поляков ; Рос. ин-т культурологии. – М. : РИК, 1997. – 253 с.

13. *Салова, Ю. Г.* Научно-исследовательская работа в музеях Центральной России : метод. указания / Ю. Г. Салова ; Яросл. гос. ун-т им. П. Г. Демидова. – Ярославль : ЯрГУ, 2012. – 52 с.

14. *Сташкевіч, А. Б.* Стварэнне музейных экспазіцый. Этап навуковага праектавання / А. Б. Сташкевіч // Навуковае праектаванне музейных экспазіцый : навук.- метад. зб. / БелІПК. – Мінск, 1996. – Вып. 1. – С. 6–16.

15. *Стрелец, М. В.* Ценный опыт формирования культуры исторической памяти / М. В. Стрелец // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2016. – № 10. – С. 55–59.

16. *Тверская, Д. И.* Музей как научно-исследовательское учреждение / Д. И. Тверская // Музейное дело в СССР / ред. И. М. Поспелова. – М., 1974. – С. 5–17.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 24.10.2022.